Упраўленне па адукацыі, спорту і турызму Дзяржынскага райвыканкама
дзяржаўная ўстанова адукацыі «Грычынская базавая школа»

# Канспект тэматычнага занятку

па адукацыйнай вобласці «Дзіця і грамадства»
Тэма: «Посуд»
«Напоім лялльку Дашу чаем»

(1,2 падгрупы малодшай рознаўзроставай групы)

Падрыхтавала: Мініч Н.М.
Выхавальнік дашкольнай адукацыі
Дата правядзення: 06.11.2024

**Задачы**:
- фарміраваць уяўленні аб прадметах бліжэйшага акружэння (посуд), іх прызначэнні і практычным выкарыстанні, гульнявых дзеяннях з цацкамі; уменне прымаць уяўную сітуацыю;
-развіваць уменне мадэляваць розныя сітуацыі, якія адлюстроўваюць уражанні, атрыманныя з назіранняў за навакольным светам, актыўна ўключацца ў зносіны ўсімі даступнымі сродкамі, адгукацца на пытанні і прапановы дарослага; сэнсорную сферу дзяцей на аснове пашырэнняў з прадметамі і цацкамі; псіхічныя пазнавальныя працэсы;
- выхоўваць беражлівыя адносіны да навакольных прадметаў - выніку працы дарослых, добразычлівасць ва ўмовах гульні побач і ў сумесных гульнях.

**Дыдактычнае абсталяванне:** лялька сярэдняга памеру (20-35 см), стол і стул сярэдняга памеру; набор чайнага посуду (кубак, цукарніца, шклянка, сподак, чайная лыжка, чайнік); абрус для стала; каляровыя алоўкі.

**Ход занятку**

**1.Прывітанне.** Добрай раніцы дзеці. Да нас сёння ў госці завітала лялька Даша. Яна вельмі хоча з намі пазнаёміцца і пасябраваць. Вы не супраць пасябраваць з лялькаю Дашай? ( *Не супраць).*Тады давайце знаеміцца.
**2.Пальчыкавая гульня.** Дарослы прамаўляе словы і выконвае адпаведныя рухі, падахвочваючы дзяцей паўтараць іх.

Добрай раніцы, Дашачка ! *дакранаюцца вялікім пальцам да ўказальнага.*

Добрай раніцы, Сашачка ! *дакранаюцца вялікім пальцам да сярэдняга.*

Добрай раніцы, Машачка ! *дакранаюцца вялікім пальцам да безымяннага.*

Добрай раніцы, Анечка ! *дакранаюцца вялікім пальцам да мезенца.*

Добрай раніцы, мамачка ! пляскаюць у далоні.
Мілая, добрая, самая !

С.Ермакова [3]

**3.Гульнявая сітуацыя.** На дыване стаяць стол і стул для лялькі. На стуле сядзіць лялька. На падносе, які размешчаны на дзіцячым стале, стаяць кубак, шклянка, сподак, цукарніца, чайнік, чайная лыжка, абрус. Дарослы паведамляе дзецям пра тое, што лялька Даша захацела чаю, і прапануе ім дапамагчы ёй накрыць стол для чаяпіцця.
- Паглядзіце на стол уважліва. Што трэба спачатку пакласці на Дашын стол, каб яна магла папіць чаю? (*Абрус.)*
Дзеці вазміце абрус і накрыйце ім стол. Што зараз мы можам паставіць на стол Дашы? (*Кубак.)* Цімафей, ідзі і выбяры кубак для нашай лялькі Дашы. А што трэба паставіць пад кубак ? (*Сподак.)* Адкуль лялька будзе насыпаць цукар? (*З цукарніцы.)* Цімур,

знайдзі цукарніцу і пастаў яе на стол.Чым лялька будзе размешваць цукар? (*Чайнай лыжкай.)*
Женечка пакладзі чайную лыжку на стол. З чаго наліваюць чай у кубкі? (*З чайніка.)*
Цімафей, пастаў чайнік на стол. Як прыгожа мы накрылі на стол! Наша лялька Даша з вялікім задавальненнем будзе піць чай, які мы з вамі ёй прыгатавалі. Яна кажа нам вялікі дзякуй. А што мы адказваем лялцы Дашы? (*Калі ласка, Даша, пі чай на здароўе!)*
Наша лялька кажа нам да пабачэння і развітваецца з намі. Дзеці, а што мы скажам нашай лялцы Дашы? (*Да пабачэння Даша, прыходзь калі ласка да нас у госці яшчэ).*

**4. Фізкультхвілінка.**

| | |
|---|---|
| **Таму, хто справа ўсміхніся,** | *паварачваюць галаву ўправа.* |
| **Таму, хто злева ўсміхніся,** | *паварачваюць галаву ўлева.* |
| **Таму, хто справа пакланіся,** | *нахілы ў правы і левы бакі.* |
| **Таму, хто злева пакланіся.** | |
| **Таму, хто справа руку дай,** | *даюць рукі адзін аднаму.* |
| **Таму, хто злева руку дай.** | |
| **Зараз па крузе ты шагай.** | *робяць круг, і ідуць па крузе.* |
| **Таго, хто справа абдымі,** | *абдымаюць сябра справа.* |
| **Таго, хто злева абдымі.** | *абдымаюць сябра злева.* |
| **Ну вось і скончылася гульня,** | *абдымаюцца ўсе разам.* |
| **І зноў сябруе дзетвара. УРА!** | |

**5.Гульня"*Наша сонца*"** Дарослы малюе на ватмане вялікі круг. Затым абрысоўвае далоні дзяцей, ствараючы такім чынам праменчыкі сонца. Пры дапамозе дарослага дзеці размалёўваюць далонькі. У выніку атрымліваецца прыгожае разнакаляровае сонца, якое вывешваецца ў группе.
Выхавальнік пытае ў дзяцей, ці спадабалася ім сення знаемства з лялькай Дашай? (*Так)*
Паклічуць яны яшчэ ляльку у госці? (*Так)*